# Да пытання аб храналогіі літоўскіх эмісій Аляксандра Ягелончыка

Юрый ДЗЕНІСЕНКА



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства»,
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск,
e-mail: dyn291171@tut.by

Андрэй КАРАЧ



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства»,
Рэспубліка Беларусь, г. Гродна,
e-mail: andrew_karach@tut.by

У 1492 г. са смерцю Казіміра Ягелончыка (1440–1492) перарываецца дынастычная унія паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім Каралеўствам. Літву наследаваў Аляксандр, а Польшчу – Ян Ольбрахт (1492–1501).

З уступленнем на вялікакняжацкі прастол Аляксандра Ягелончыка (1492–1506) у Літве пачаўся новы перыяд развіцця – гэта пераходны этап ад Сярэднявечча да Новага часу. Прынцыпова змяніліся таксама і спосабы вырабу манет. Літоўская чаканка была прадстаўлена біццём дэнарыяў і паўгрошаў [1, с. 135–151]. Упершыню на манетах ВКЛ былі ўведзены легенды на лацінскай мове. Так, на аверсе паўгроша размяшчаўся дзяржаўны герб Гедымінавічаў «Пагоня», вакол яго – надпіс MON ALEXANDRI, што значыць «манета Аляксандра». На рэверсе змяшчаўся «Арол» – герб дынастыі Ягелонаў, вакол якога надпіс MAGNI DVC LITVANIE («Вялікага князя Літоўскага»). Такім чынам, надпіс сведчыў аб прыналежнасці манеты не да Вялікага Княства Літоўскага, а менавіта вялікаму князю Аляксандру – «манета Аляксандра – Вялікага князя Літоўскага». Упершыню на літоўскіх манетах з'явіўся герб Ягелонаў «Арол». Гэтым падкрэсліваліся віды Аляксандра і на польскую карону. Пенязі былі анэпіграфічнымі з выявай «Пагоні» на аверсе і «Арла» на рэверсе.

Здавалася б, манеты Аляксандра ўжо дастаткова добра вывучаны і прааналізаваны. Існуе цэлы шэраг даследаванняў, прысвечаных менніцтву Аляксандра. Паколькі на саміх манетах няма даты выпуску, розныя даследчыкі ў розныя часы выказвалі свае думкі адносна датавання эмісій і пачатку функцыянавання самога манетнага двара. Да сённяшняга часу, здаецца, самым спрэчным з'яўляецца пытанне аб храналогіі эмісійнай дзейнасці Віленскай мынцы ў часы Аляксандра.

Канкрэтных дакументаў аб дзейнасці манетнага двара не захавалася (ці яшчэ не выяўлена). Пэўную інфармацыю мы можам знайсці ў двух дакументах. Першы датуецца 9 чэрвеня 1499 г., калі гаспадарскі маршалак Ян Літавор Храптовіч робіць справаздачу вялікаму князю аб дзейнасці мынцы за 4 гады (з 1495 г. па чэрвень 1499 г.) [2, с. 338]. З гэтай справаздачы невядома, якія наміналы біліся ў мынцы ў гэты перыяд і ці працавала мынца да 1495 г. У дакуменце не ідзе гаворка аб адкрыцці манетнага двара і аб закупцы неабходнага абсталявання, што патрабавала даволі вялікіх сродкаў. У сувязі з гэтым польскі даследчык М. Гумоўскі выказваў думку, што гэта была не першая справаздача і мынца функцыянавала і раней [3, с. 8]. Але ёсць і іншыя думкі, напрыклад літоўскіх даследчыкаў Э. Іванаускаса [4, с. 12–13] і Э. Рэмецаса [5, s. 58], якія ўказваюць, што гэта справаздача была першай і мынца пачала сваю эмісійную дзейнасць менавіта з 1495 г. Адкрыццё манетнага двара і арганізацыя яго бесперабойнага функцыянавання патрабавалі вялікай арганізацыйнай працы. На гэта і спатрэбілася некалькі гадоў пасля ўступлення на прастол Аляксандра. Новы вялікі князь прыняў дзяржаву ў вельмі неспакойныя часы – працягвалася вайна з Масковіяй, якая скончылася ў 1494 г. падпісаннем «вечнага міру» [6, с. 56].

Другі афіцыйны дакумент, які сведчыць аб дзейнасці Віленскай мынцы, датуецца 8 снежня 1506 г. Новы вялікі князь Жыгімонт Стары (1506–1548) дае ліст маршалку М. Глінскаму, у якім засведчана прыняцце «лічбы» аб дзейнасці мынцы і вайскоўні за папярэднія 5 гадоў (1501–1506 гг.) [7, с. 133]. Ні канкрэтных наміналаў, ні прыходна-расходных аперацый, якія б сведчылі аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці мынцы, не пазначана.

Такім чынам, з двух вышэйзгаданых дакументаў аб дзейнасці мынцы ў часы Аляксандра вядома, што яна дакладна дзейнічала ў перыяд з 1495 г. па 1499 г. і з 1501 г. па 1506 г. Невядома, ці была якая-небудзь актыўнасць у перыяд з 1499 г. па 1501 г. Пра выпуск тых ці іншых наміналаў у гэтыя перыяды таксама нічога не вядома.

Тут на дапамогу зноў прыходзяць архіўныя дакументы. Намі было выяўлена, што самы ранні дакумент, які згадвае слова «паўгрош» у значэнні манета, датуецца канцом 1495 г. [8, с. 20–21]. Такім чынам, паўгрошы дакладна біліся ў 1495 г. Але зараз знойдзены яшчэ ранейшы дакумент, які дазваляе на паўтара года перамясціць першую згадку аб паўгрошы. Так, у прывілеі кіеўскім мешчанінам аб вызваленні ад некаторых павіннасцяў у прыватнасці згадваецца: «... От пресного меду сосудины с века по полугрошку...» (26.05.1494) [9, с. 52]. Несумненна, што згаданы «полугрошка» гэта менавіта літоўскі паўгрош, і можна сцвярджаць, што Віленская мынца працавала ўжо ў 1494 г. і біла паўгрошы.

Што датычыцца манет больш дробнага наміналу – пенязяў, то першая выяўленая намі згадка – гэта сакавік 1498 г. [8, с. 21]. Такім чынам, абапіраючыся толькі на гэтыя пісьмовыя крыніцы, можна зрабіць асцярожныя вывады, што манетны двор ужо мог працаваць у 1494 г. і выпускаць паўгрошы, а пенязі пачалі біцца толькі праз некаторы час – прыкладна праз 3–4 гады.

Тыпалогія паўгрошаў і пенязяў дастаткова добра апісана ў літаратуры [10; 11; 12]. Па шрыфтах легенд паўгрошы дзеляцца на «гатычныя» і «рэнесансныя». Яны адрозніваюцца напісаннем літар «M» і «N» на манетах. Даўно ўжо было адзначана, што «развіццё» штэмпеляў паўгрошаў па разнавіднасцях арла адпавядае такому ж «разьвіццю» штэмпеляў на пенязях [11, с. 124]. Для большага разумення гэтага працэсу давайце звернемся да малюнка, які адлюстроўвае паслядоўнасць іх біцця (*малюнак 1*).

Біццё пенязяў ідзе паралельна з біццём паўгрошаў, за выключэннем перыяду, калі выпускаліся паўгрошы № 1–3. Яны маюць тры асноўныя тыпы арла, і адпаведных ім пенязяў няма. Зыходзячы з вопыту вывучэння літоўскіх манет Аляксандра Ягелончыка, можна сказаць, што выпуск гэтых тыпаў




*Адпаведнасць штэмпеляў літоўскіх паўгрошаў і пенязяў Аляксандра*

***Малюнак 1***

паўгрошаў (за выключэннем тыпу № 2) працягваўся доўгі час, бо саміх манет даволі многа. На нашу думку, па часе гэта не менш за 3–4 гады. Большасць сучасных даследчыкаў манет гэтага перыяду (Э. Іванаускас, Дз. Гулецкі, Г. Багдонас, А. Грамыка і інш.) прытрымліваюцца версіі, што біццё пачалося менавіта з гэтых «гатычных» паўгрошаў, а пенязі некалькі першых гадоў дзейнасці мынцы не выпускаліся, і толькі потым эмісіі ішлі паралельна. Мы ўстанавілі, што паўгрошы былі ўжо вядомы з крыніц з 1494 г., а пенязі – з 1498 г. Розніца якраз у чатыры гады! Аднак, ці так гэта на самой справе?

Прааналізуем стылістыку і шрыфты літоўскіх і каронных паўгрошаў. Ёсць меркаванне, што кіраўніцтва мынцай прыехала з Кракава, бо там ужо паспяхова дзейнічала каралеўская мынца і частка манетчыкаў, верагодна, была адтуль. Заказваць, напрыклад, нямецкіх або чэшскіх манетчыкаў у перыяд не надта добрага фінансавага становішча краіны было б вельмі непрадбачліва. І тут на першы план выходзіць імя Генрыха Шлягера. З 1495 г. па 1501 г. і ў 1504 г. імя Генрыха Шлягера неаднаразова сустракаецца ў дакументах справаводства ВКЛ. У дакуменце, датаваным 1495 г., рэвельскія купцы накіроўваюць ліст да некага *Hinrico Flocher monetario in Vilna*, разлічваюць на яго падтрымку і кажуць пра яго як пра чалавека, блізкага да вялікага князя. Літоўскі даследчык Лаймонтас Караліус выказаў меркаванне, што тут ідзе размова менавіта пра Генрыха Шлягера, толькі няправільна была перапісана першая літара. Прапісная лацінская літара «S» была трошкі нахіленай і вельмі нагадвала «f» [13, с. 188–189]. Гэта версія выглядае цалкам слушнай.

Пра даволі блізкія адносіны паміж Аляксандрам і Шлягерам сведчыць цэлы шэраг дакументаў. У снежні 1495 г. яго імя «*Шлякгир*» згадваецца ў пастанове аб ковенскай мыце [2, с. 308]. 1 сакавіка 1496 г. Аляксандр аддае *минцерю Шлякгеру* ў арэнду ковенскую мыту на тры гады за штогадовую плату ў памеры 450 кап. грошай [2, с. 241]. У 1500 г. вялікі князь за верную службу дае «*слузе и мынцъару нашому Пиндрыху Шлякгиру*» землі ў Ковенскім павеце з правам закладання ставаў і млыноў [9, с. 154], а ў 1501 г. «*слузе и мынцару нашому Гендріху Шлякгеру*» маёнтак з людзьмі ў Берштанскай воласці [14, с. 179–180]. Верагодна, Шлягер быў тэхнічным кіраўніком мынцы – займаў пасаду мынцмайстра, а агульнае кіраванне мынцай заставалася за гаспадарскім маршалкам, бо менавіта Ян Літавор Храптовіч даваў справаздачу аб дзейнасці мынцы ў 1499 г. [7, с. 133].

Польскі даследчык Фрэдэрык Папе піша, што ў асобе Г. Шлягера вялікі князь знайшоў чалавека, з дапамогай якога можна ажыццявіць манетную рэформу і выпускаць добрую манету [15, с. 31]. Абсалютна невядома, якім чынам Г. Шлягер здолеў стаць правадыром манетнай рэформы ў ВКЛ.

У 1501 г. апошні раз згадваецца яго імя ў дакументах, якія датычацца тэрыторыі ВКЛ. Гэта звязана з тым, што ён зноў пераехаў у Кракаў, бо пасля смерці Яна Ольбрахта ў 1501 г. Аляксандр атрымаў яшчэ і Польскую Карону. У Польшчы трэба было ўзнаўляць працу манетнага двара, і на гэтую ролю лепшага чалавека, чым Г. Шлягер, было не знайсці. 4 кастрычніка 1502 г. пасля працяглых перамоў Кракаўская мынца была адчынена, на чале стаў менавіта Г. Шлягер [16, с. 125].

З сабой Г. Шлягер пазваў і сваіх родзічаў – швагра Ульрыха Гозі і мужа пляменніцы Генрыха Карловіча, якія ў Кракаве займаліся пастаўкай срэбра на мынцу [17, с. 323–324]. 31 снежня 1504 г. паведамляецца пра ўжо нябожчыка *Пиндриха Шлякгира* і тое, што ён рэкамендаваў трыманне ковенскай мыты сваім сябрам – Г. Карловічу і У. Гозу [18, с. 410–411]. Апошнія трымалі ковенскую мыту ўвесь вызначаны тэрмін [19, с. 195] да канца 1506 г. [7, с. 130–131]. Цалкам верагодна, што і манетчыкі ніжэйшага ранга патрапілі ў Вільню з Кракава і прынеслі адтуль свае веды і навыкі. У гэтым выпадку вялікая верагоднасць таго, што ў чымсьці будзе назірацца падабенства літоўскіх і каронных манет гэтага перыяду (Аляксандра і Яна Ольбрахта адпаведна). Сапраўды, калі паглядзець на *малюнак 2*, то звяртае на сябе ўвагу падобная іканаграфія арла (хвост і прамыя крылы) і напісанне літары «е» кароннага паўгроша, але не з «гатычным» літоўскім паўгрошам № 1, а з «рэнесансным» № 10. Такую ж літару «е» маюць манеты тыпу № 9 і часткова тыпу № 8 (*малюнак 1*).

З гэтага можна зрабіць выснову, што біццё манет у Вільні пачалося менавіта з паўгрошаў «рэнесанснага» тыпу. А чаму ж на іх не выкарыстоўваўся чыста гатычны шрыфт, калі разьбяры з Кракава? На нашу думку, гэта звязана з жаданнем кіраўніцтва ВКЛ адрозніваецца ад Кароны ў грашовай палітыцы не толькі метралагічна (лотавая проба, вага манет), але і візуальна. Тым больш што ў ВКЛ значна хутчэй, чым у кансерватыўнай Польшчы, набіралі моц традыцыі эпохі Адраджэння.

Выснова аб пачатку эмісій з «рэнесансных» манет таксама пацвярджаецца тым, што сярод паўгрошаў тыпу № 9 і № 10 (*малюнак 1*) можна назіраць найбольшую колькасць розных памылак і варыянтаў напісання легенд [12, с. 15–34], а гэта часта было характэрна менавіта для пачатковага этапу манетнай вытворчасці. Дарэчы, таксама гэтая выснова ўскосна пацвярджаецца яшчэ тым, што пеняз з тыпам «Арла», адпаведным дастаткова масаваму паўгрошу № 10 (біццё на працягу не менш за тры гады), сустракаецца ў прощвагу яму даволі рэдка, г. зн. эмісія гэтых пенязяў закранула толькі малую частку эмісіі паўгрошаў № 10, што таксама пацвярджае значны зрух па часе паміж гэтымі выпускамі манет. Таму, з улікам вышэйназванага, хутчэй за ўсё, пачатак біцця пенязяў прыйшоўся на 1497 г., што цалкам адпавядае часу першых звестак пра іх у 1498 г.

Прыведзены на *малюнку 2* тып паўгрошаў Яна Ольбрахта з кветкай пад каронай з'яўляецца самай распаўсюджанай і масавай яго манетай, а значыць, можна смела сказаць, што ён выпускаўся на працягу 5–6 гадоў. Затым у Кракаўскай чаканцы з'яўляецца новы тып паўгрошаў – з кольцам пад каронай, трохі змененым шрыфтам і іншай іканаграфіяй арла. Падзелім яго на два падтыпы – «а» і «b», якія адрозніваюцца напісаннем літары «е». На *малюнку 3* змешчаны параўнальны аналіз гэтых падтыпаў каронных паўгрошаў з літоўскімі паўгрошамі Аляксандра Ягелончыка. Як бачым,




*Параўнанне каронных паўгрошаў Казіміра, Яна Ольбрахта і літоўскіх паўгрошаў Аляксандра Ягелончыка*

***Малюнак 2***

выяўляецца падабенства з літоўскімі манетамі № 6 і № 7 (*малюнак 1*), а таксама часткова № 8. Адзначым, што аналагічнае напісанне літары «е», як у тыпе № 6, можна таксама назіраць на «рэнесансны» частцы паўгрошаў змешанага варыянту, так званых «готыка-рэнесансных» і «рэнесансна-гатычных» (*малюнак 1 № 5*).

Калі сыходзіць з таго, што тып каронных паўгрошаў з кольцам быў апошнім у выпусках Яна Ольбрахта і ён вельмі нячасты – R1 [20, с. 42], то можна сказаць, што ў параўнанні з папярэднім гэты тып біўся на працягу значна меншага часу, напэўна, не больш за 1–1,5 года. Выходзячы з гэтага, можна выказаць здагадку, што змена тыпаў каронных паўгрошаў Яна Ольбрахта адбылася бліжэй да 1500 г. Адпаведна, з улікам даных на *малюнку 3* і маючы на ўвазе верагоднае «перамяшчэнне» пэўнага кракаўскага разьбяра, напрошваецца высновa аб тым, што ў літоўскіх эмісіях Аляксандра паўгрошы тыпу № 7 (і часткова тыпу № 8) з'явіліся дзесьці ў гэты ж перыяд – прыкладна ў 1500 г. Паўгрошы тыпу № 6 выпускаліся, хутчэй за ўсё, пасля пераезду ў Вільню іншага адпаведнага кракаўскага разьбяра, і звязана гэта са смерцю Яна Ольбрахта ў другой палове 1501 г. і часовым закрыццём Кракаўскага манетнага двара. Гэтыя літоўскія паўгрошы не рэдкія, але сустракаюцца не так часта, як паўгрошы тыпу № 1–3, і выпускаліся, хутчэй за ўсё, значна меншы перыяд часу – каля 1,5–2 гадоў. За гэтым тыпам ідуць паўгрошы «змешанага» тыпу (*малюнак 1 № 5*). Такім чынам, можна сцвярджаць, што змена ты-




*Параўнанне падтыпаў каронных паўгрошаў Яна Ольбрахта і літоўскіх паўгрошаў Аляксандра Ягелончыка*

***Малюнак 3***

пу віленскіх паўгрошаў на «гатычны» адбылася прыкладна на рубяжы 1502–1503 гг. Гэта цалкам можа быць звязана з прызначэннем Г. Шлягера мынцмайстрам Кракаўскай мынцы (аднавіла працу



*Тыпы каронных паўгрошаў Аляксандра Ягелончыка (м.д. Кракаў)*

***Малюнак 4***

ў кастрычніку 1502 г.) і яго пераездам у Польшчу [21, с. 271–276]. Затым выпускаліся манеты тыпу № 4 (*малюнак 1*), а дзесьці ў пачатку 1504 г. пачалося біццё паўгрошаў № 1–3, якія не маюць аналагаў сярод пенязяў. Такім чынам, на нашу думку, пенязь спынілі выпускаць прыкладна ў гэты ж час – у першай палове 1504 г. Варта адзначыць, што выпуск пенязяў на Кракаўскай мынцы таксама быў даволі хутка спынены пасля аднаўлення яе працы. Як мы казалі раней, паўгрошы тыпаў № 1–3 дастаткова шматлікія і біліся на працягу некалькіх гадоў – гэта таксама ўскосна пацвярджае нашы высновы. Сапраўды, па нашых разліках, з улікам часу закрыцця Віленскай мынцы ў канцы 1506 г., працягласць біцця гэтых тыпаў паўгрошаў складае менавіта каля трох гадоў.

А навошта трэба было мяняць тып паўгрошаў з «рэнесанснага» на «гатычны»? На нашу думку, гэта звязана са спробай Аляксандра Ягелончыка пасля таго, як ён стаў каралём польскім у 1501 г., хаця б часткова візуальна ўніфікаваць літоўскую і польскую манету ў адпаведнасці з рашэннем Мельніцкай уніі. Сапраўды, у перыяд 1503–1506 гг. мы маем чыста «гатычны» тып як літоўскіх, так і каронных манет.

Неабходна адзначыць, што пасля аднаўлення выпуску паўгрошаў Аляксандрам Ягелончыкам у Кракаве ў кастрычніку 1502 г. яны мелі тры асноўныя «шрыфтавыя» разнавіднасці (*малюнак 4*). Як бачым, напісанне літар «е» да трэцяга тыпу (апошняга ў чаканцы) зведала некаторую змену – «акенцы» ў іх сталі паўкруглымі.

Далей шрыфтавыя і іканаграфічная карэляцыі назіраюцца паміж кароннымі і літоўскімі манетамі ў канцы праўлення Аляксандра Ягелончыка – пачатку праўлення Жыгімонта Старога. Гэта нам наглядна дэманструе *малюнак 5*.

Звяртае на сябе ўвагу падабенства ў напісанні літары «е» (паўкруглыя «акенцы»!!!), а таксама тое, што менавіта арол паўгрошаў № 1 (*ма-*




*Параўнанне літоўскіх і каронных паўгрошаў Аляксандра і Жыгімонта Старога*

***Малюнак 5***

*люнак 1*) па сваёй іканаграфіі падобны да арла на паўгрошах наступнага вялікага князя Жыгімонта Старога. Гэта таксама сведчыць аб тым, што паўгрош № 1 быў апошнім у літоўскай чаканцы Аляксандра. Прычым, зыходзячы з аналізу *малюнкаў 4* і *5*, важна адзначыць, што адзін з разьбяроў пераехаў менавіта з Вільні ў Кракаў, бо напісанне літары «е» з паўкруглымі «акенцамі» на літоўскіх манетах з'явілася раней, чым на каронных.

Можна заўважыць, што ў часы Жыгімонта Старога каронныя і літоўскія паўгрошы зноў падзяліліся на «рэнесансныя» і «гатычныя», але наадварот: літоўскія сталі «гатычнымі», а каронныя – «рэнесанснымі». Гэта звязана, хутчэй за ўсё, з жаданнем новага караля Жыгімонта і польскай шляхты «злёгку прынізіць» Вялікае Княства, надаць яму, а не Польшчы, нотку кансерватыўнасці, якая заўсёды была ўласціва менавіта Польскаму Каралеўству.

Такім чынам, шляхам шрыфтавога і іканаграфічнага аналізаў, а таксама супастаўлення працягласцей чаканкі з рэдкасцю манет мы атрымалі новую храналогію біцця асноўных тыпаў паўгрошаў і пенязяў (*малюнак 6*).

З усяго вышэйапісанага можна сфармуляваць канчатковыя высновы:

1. Біццё літоўскіх паўгрошаў і пенязяў пачалося пасля адкрыцця Віленскага манетнага двара з «рэнесансных» манет, якія прыкладна на мяжы 1502–1503 гг. змяніліся на «гатычныя». Пенязі, хутчэй за ўсё, пачалі біць на некалькі гадоў пазней, прыблізна ў 1497 г.

2. Эмісія пенязяў спынілася, хутчэй за ўсё, у першай палове 1504 г., і далей да 1506 г. уключна выпускаліся толькі паўгрошы.




*Храналогія эмісій літоўскіх паўгрошаў і пенязяў у часы кіравання Аляксандра Ягелончыка*

***Малюнак 6***

***Бібліяграфічны спіс:***

1. *Ivanauskas, E. Coins and bars of Lithuania 1236–2012. T. I / E. Ivanauskas. – Kaunas: Kopa, 2013. – 600 p.*
2. *Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 6 (1494–1506). Užrašytų knyga 6 / Parengė A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 2001. – 506 p.*
3. *Gumowski, M. Mennica wileńska w XVI i XVII w. / M. Gumowski. – Warszawa, 1921. – 200 s.*
4. *Ivanauskas, E. Lietuvos monetų kalybos istorija 1495–1769 / E. Ivanauskas, R. J. Douchis. – Vilnius: Savastis, 2002. – 312 p.*
5. *Remecas, E. XVI a. monetų apyvarta dabartinės Lietuvos teritorijoje / E. Remecas // Pinigų studijos. Ekonomikos istorija. – 2002. – Nr. 2. – P. 58–77.*
6. *Карач, А. Про початок діяльності Вільнюського монетного двору в часи Олександра Ягеллончіка (1495–1506 рр.) / А. Карач // Львівські нумізматичні записки. – 2014–2015. – № 11, 12. – С. 56–57.*
7. *Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 8 (1499–1514). Užrašytų knyga 8 / parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1995. – 709 p.*
8. *Карач, А. Аб некаторых спрэчных патаннях грашовай сістэмы ВКЛ падчас праўлення Аляксандра Ягелончыка (1492–1506 гг.) / А. Карач // Банкаўскі веснік. – 2017. – № 12 [653]. – С. 19–22.*
9. *Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 5 (1427–1506). Užrašytų knyga 5 / parengė A. Baliulis, A. Dubonis, D. Antanavičius. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1993. – 516 p.*
10. *Какареко, В. Монетное дело Александра Казимировича (1492–1506) / В. Какареко // Банкаўскі веснік. – 2008. – № 7. – С. 61–68.*
11. *Громыко, А. Литовские монеты Александра Казимировича: классификация и периодизация / А. Громыко // Калекцыйная спадчына Вялікага княства. – Мінск: Логвінаў, 2008. – С. 117–132.*
12. *Huletski, D. Early Lithuanian half-groats 1495–1529 / D. Huletski, G. Bagdonas, M. Darashkevich. – Kaunas, 2017. – 174 p.*
13. *Karalius, L. Kauno muitininkas Henrikas Sliacheris (1496–1499, 1504) / L. Karalius // Kauno istorijos metraštis. – 2002. – T. 3. – S. 185–201.*
14. *Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 25 (1387–1546). Užrašytų knyga 25 / parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. – 461 p.*
15. *Papée, F. Aleksander Jagiellończyk / F. Papée. – Kraków: Polska Akademia Umiejętności, 1949. – 120 s.*

16. *Gumowski, M. Mennica koronna za Aleksandra Jagiellończyka / M. Gumowski // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. – 1909. – № 7. – S. 125–127.*

17. *Gumowski, M. Ulryk Hozjusz, ojciec kardynała, horodniczy wileński / M. Gumowski // Przegląd powszechny. – 1926. – T. 171. – S. 321–329.*

18. *Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 1 (6). Сборник документов канцелярии Великого князя Литовского Александра Ягеллончика (1494–1506) / отв. ред. С.М. Каштанов. – М., СПб.: Нестор – История, 2012. – 664 с.*

19. *Акты Литовской метрики. Т. 1. Вып. 2 (1499–1507) / сост. Ф.И. Леонтович. – Варшава: Типография Варш. Учебн. Округа, 1897. – 201 с.*

20. *Kopicki, E. Ilustrowany skorowidz pieniędzy polskich i z Polską związanych: 4 T. / E. Kopicki. – Warszawa: Polskie Towarzystwo Numizmatyczne, 1995. – T. 1: Teksty (poz. 1–7058). – 315 s.*

21. *Piekosiński, F. O monecie i stopie menniczéj w Polsce w XIV i XV wieku / F. Piekosiński // Rozprawy i Sprawozdania z Posiedzeń Wydz. Hist.-Filozof. Akad. Umiejęt. w Krakowie. – 1878. – T. IX. – S. 1–320.*

# On the issue of the chronology of Lithuanian issues of Alexander Jagiellon

**Yury DZENISENKA,** *Member of the Public Association "Belarusian Numismatic Society", Republic of Belarus, Minsk, e-mail: dyn291171@tut.by.*

**Andrei KARACH,** *Member of the Public Association "Belarusian Numismatic Society", Republic of Belarus, Grodno, e-mail: andrew_karach@tut.by.*

**Abstract.** *The study examines the dating and chronology of the issue during the reign of Alexander II Jagiellon (1492-1506). Based on the written sources, comparison of dies, analysis of the font style and comparison of coins minting and rarity duration, the authors suggest a revised chronology of minting in the described period.*